## Урок беларускай мовы ў 1 класе

**Тэма:** Я і мая сям'я. Адзенне і абутак.

**Мэты:** 1. Вучыць адрозніваць беларускае маўленне ад рускага на слых, паўтарыць пройдзеныя фанетыка-арфаэпічныя асаблівасці беларускай мовы, пазнаёміць з лексікай, якая абазначае адзенне і абутак.

2. Развіваць уменне асэнсавана ўспрымаць беларускую мову на слых, адказваць на пытанні.

3. Выхоўваць акуратнасць, працавітасць.

### Ход урока

1. **Арганізацыйны момант**
   Добры дзень, мой першы клас
   Вельмі рада бачыць вас.
2. **Маўленчая размінка**
   1). Паўтарэнне
   Давайце прыгадаем гукі, якія мы вучыліся правільна вымаўляць
   Газета – [г]
   Воўк - [ў]
   Цень - [ц']
   Дзік - [дз']
   Чайка - [ч]
   Рабіна - [р]
   Джала - [дж]
   Спалучэнне гукаў:
   Шчотка - [шч]
   2). Маўленчае практыкаванне
   Давайце пагуляем у гульню «Знайдзі лішняе»
   Газета, голас, гараж, холад;
   Воўк, лаўка, сава, пеўнік;
   Рабіна, рэчка, лапа, рэпа;
   Дом, дах, адзенне, дрэва.
3. **Фізкультмінутка**
4. **Лексічная работа**

1) Гутарка па тэме
   Сёння мы даведаемся, як называюцца па-беларуску рэчы, якія мы апранаем і абуваем.

Уважліва паглядзіце на малюнкі, назавіце іх на рускай мове, а я скажу як яны называюцца па-беларуску.









2) Работа ў падручніку (с. 22- 23)
3) Маўленчае практыкаванне

   Паслухайце верш і скажыце, чаму злуецца Фядот:

   Калі ранак настае –
   Гора для Фядота:
   – Хто надзеў штаны мае?
   Куды збеглі боты?
   Пераверне ўсё ўверх дном,
   Бегае, злуецца:
   – Тут, на стуле, за сталом,
   я іх клаў, здаецца.

   І. Муравейка

   Чаму злуецца Фядот? Як вы разумееце выраз пераверне ўсё ўверх дном? Што вы параіце Фядоту?
4) Работа па картках

   Гульня « Што дзе ляжыць?»

**5. Гімнастыка для вачэй**

6. **Аўдзіраванне**
   1) Падрыхтоўка да слухання верша
      Якая зараз пара года? Што можна рабіць дзецям зімой? Як апранаюцца, калі ідуць катацца на лыжах?
   2) Слуханне верша «Вось дык прагулка!..» Васіль Жуковіч
   3) Гутарка па змесце верша
      Якую памылку зрабіў Янка? Чаму яму было сумна?
   4) Хвілінка адкрыццяў
      У беларускай мове ёсць словы, якія цяжка растлумачыць:
      Закарцела – очень захотелось
      Ратунак - спасение
   5) Работа па картках
      Размалюйце зімовае адзенне дзяцей
7. **Вынік урока**
   Вымаўленне якіх гукаў паўтарылі? Назвы якіх прадметаў адзення і абутку вы запомнілі?
8. **Рэфлексія**
   Давайце станем ў кружок і скажам дзякуй за ўрок!